**Знешнеэканамічныя сувязі.** Сярод важнейшых відаў экспартуемай прадукцыі Віцебскай вобласці — паліва мінеральнае, палімеры этылену, шкловалакно, абутак, хімічныя валокны і ніткі, правады і кабелі, нафтапрадукты, звадкаваны газ, прадукцыя малочнай прамысловасці, мяса і мясныя прадукты.

**Абагульнім і запомнім.** Віцебская вобласць дрэнна забяспечана аграклiматычнымі рэсурсамі. У вобласці найбольшае натуральнае змяншэнне насельніцтва. Галіны спецыялізацыі — нафтаперапрацоўка і хімічная прамысловасць, вытворчасць электраэнергіі, ільняных тканін і дываноў. Віцебская вобласць валодае высокім рэкрэацыйным патэнцыялам тэрыторыі.

1. Якія геалагічныя падзеі аказалі ўплыў на прыроду Віцебскай вобласці? 2. Назавіце галіны спецыялізацыі прамысловасці вобласці.

3. Якія фактары абумовілі ўзнікненне самых старых і самых маладых гарадоў вобласці? 4. Якая спецыялізацыя прамысловасці Віцебскай вобласці? 5. Вызначце ўзаемасувязь паміж прыродна-кліматычнымі ўмовамі і спецыялізацыяй сельскай гаспадаркі вобласці.

***Ад тэорыі да практыкі.*** Выкарыстоўваючы дадатковы матэрыял, складзіце геаграфічны партрэт вобласці, вылучыўшы асноўныя прыродныя, сацыяльныя і эканамічныя характарыстыкі тэрыторыі.

## § 46. Гомельская вобласць

***Узгадваем.*** *Які рэгіён Беларусі з'яўляецца багацейшым на карысныя выкапні? Якая тэрыторыя больш за ўсё пацярпела ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС?*

**Роля вобласці ў гаспадарцы краіны.** Па ўдзельнай вазе валавога рэгіянальнага прадукту ў ВУП краіны (10,6 %) Гомельская вобласць саступае толькі Мінску і Мінскай вобласці. Тут засяроджана каля 20 % прамысловай вытворчасці краіны. На долю прамысловасці прыходзіцца амаль 37,9 % ВРП вобласці (мал. 176).




Мал. 176. Структура ВРП Гомельскай вобласці, %

**Геаграфічнае становішча вобласці.** Гомельская вобласць размяшчаецца на паўднёвым усходзе Беларусі і мяжуе з Расіяй і Украінай. Частка мяжы пасля аварыі на ЧАЭС апынулася ў межах зоны адчужэння.

У вобласці знаходзіцца самы паўднёвы пункт краіны. Гомельская вобласць самая буйная ў краіне па плошчы — 40,4 тыс. км$^2$.

**Прыродныя рэсурсы.** Складаная геалагічная будова абумовіла багацце Гомельскай вобласці карыснымі выкапнямі. Тут здабываюцца нафта і торф. На захадзе і поўдні вобласці ёсць радовішчы бурага вугалю і гаручых сланцаў, распрацоўка якіх магчымая ў перспектыве. Гомельская вобласць валодае вялікімі запасамі калійных (Петрыкаўскае, Акцябрскае) і каменнай (Мазырскае, Давыдаўскае) солей. Разведаны радовішчы шкловых і фармовачных пяскоў, гіпсу, кааліну, будаўнічага каменю і інш. Большасць з іх сустракаецца толькі ў Гомельскай вобласці.

Тэрыторыя вобласці размешчана ў межах Палескай і Прыдняпроўскай нізін з высокай забалочанасцю і лясістасцю. Сельскагаспадарчыя землі займаюць 33 % тэрыторыі, што значна менш, чым у іншых абласцях. Тут шырока распаўсюджаны дзярновыя забалочаныя, тарфяна-балотныя і поймавыя глебы. Больш за палову сельскагаспадарчых угоддзяў займаюць меліяраваныя землі.

Гомельская вобласць добра забяспечана агракліматычнымі рэсурсамі. *Якія сярэднія тэмпературы студзеня і ліпеня, а таксама вегетацыйны перыяд характэрныя для паўднёвага ўсходу краіны?* У выніку пацяплення клімат набліжаецца да лесастэпавага. Вобласць дастаткова добра забяспечана воднымі рэсурсамі. Тут працякаюць самыя буйныя і паўнаводныя рэкі краіны. Шырокія поймы рэк абумовілі фарміраванне вялікай колькасці азёр-старыц. З буйных азёр рэштакавага паходжання вылучаецца возера Чырвонае ў Жыткавіцкім раёне.

Знайдзіце буйнейшыя рэкі на карце атласа (с. 6–7, 16–17, 64) і ўзгадайце асаблівасці іх гідралагічнага рэжыму.

Лясістасць у Гомельскай вобласці максімальная ў краіне і складае каля 50 %. З прыродаахоўных аб'ектаў тут знаходзяцца НП «Прыпяцкі», больш за 50 заказнікаў і 60 помнікаў прыроды. Вобласць характарызуецца наяўнасцю рэгіянальных экалагічных праблем. Нават праз 30 гадоў пасля аварыі на ЧАЭС плошча забруджаных радыенуклідамі зямель складае больш за 60 %. Тут размяшчаецца зона адчужэння з Палескім радыяцыйна-экалагічным запаведнікам. Ён з'яўляецца ўнікальнай пляцоўкай для вывучэння ўздзеяння радыяцыі на жывыя арганізмы.

**Насельніцтва.** Па колькасці насельніцтва (1415,7 тыс. чал.) Гомельская вобласць займае 2-е месца пасля Мінскай. Па шчыльнасці насельніцтва (30 чал./км$^2$) пераўзыходзіць толькі Віцебскую. *Узгадайце асаблівасці сельскага рассялення на Палессі.* На размяшчэнне насельніцтва і яго колькасць вялікі ўплыў аказала аварыя на ЧАЭС. На забруджаных

тэрыторыях пражывае больш за 75 % насельніцтва вобласці. Паводле нацыянальнага складу пераважаюць беларусы (больш за 88 %). Геаграфічнае становішча вобласці абумовіла значную долю рускіх (каля 8 %) і ўкраінцаў (больш за 2 %).

**Прамысловасць.** У вобласці працуе больш за 1300 прадпрыемстваў, каля 200 з якіх адносяцца да буйных і сярэдніх.

Гомельская вобласць характарызуецца найбольш развітой горназдабыўной прамысловасцю. На яе долю прыходзіцца 4,2 % прамысловай вытворчасці. Тут сканцэнтраваны ўвесь аб'ём здабычы нафты і спадарожнага газу, шкловых і фармовачных пяскоў і інш. У Рэчыцы працуе адзіны ў краіне газаперапрацоўчы завод.

З-за раўніннага рэльефу ў вобласці няма ГЭС. Практычна ўся электраэнэргія выпрацоўваецца на ЦЭЦ, якія працуюць у Гомелі, Светлагорску, Мазыры і Добрушы. Падумайце, чаму яны размешчаны менавіта ў гэтых гарадах. Якія альтэрнатыўныя крыніцы электраэнергіі найбольш перспектыўныя для Гомельскай вобласці?

У структуры апрацоўчай прамысловасці лідзіруюць вытворчасць нафтапрадуктаў (43 %), металургічная (17 %) і харчовая (16 %) прамысловасць. Галоўная галіна спецыялізацыі — нафтаперапрацоўка. Мазырскі НПЗ вырабляе амаль палову прамысловай прадукцыі вобласці. На другім месцы па аб'ёме прамысловай прадукцыі знаходзіцца металургія. Беларускі металургічны завод знаходзіцца ў *Жлобіне*, ён вырабляе амаль 100 % сталі і пракату ў краіне, стальныя трубы, металакорд і іншую прадукцыю. Самай вядомай прадукцыяй харчовай прамысловасці з'яўляюцца малочныя кансервы (Рагачоў), харчовая соль (*Мазыр*), маргарын (Гомель), цукеркі (Гомель, Нароўля, Мазыр).

Машынабудаўнічыя прадпрыемствы размяшчаюцца ў Гомелі і буйных гарадах. Яны выпускаюць корма- і збожжаўборачныя камбайны, металаапрацоўчыя станкі і іншую прадукцыю. У вобласці развіта хімічная вытворчасць. Тут вырабляюцца практычна ўсе фосфарныя ўгнаенні краіны (Гомель), каля 80 % мыла і нятканых матэрыялаў (Гомель), хімічныя валокны (Светлагорск), мыйныя сродкі (Калінкавічы).

Добра развіта дрэваапрацоўчая, мэблевая і цэлюлозна-папяровая прамысловасць. Найбольшае значэнне мае вытворчасць драўнянай цэлюлозы, паперы і кардону (Светлагорск), школьных сшыткаў (Добруш), шпалер (Гомель), мэблі (Гомель, Мазыр). Вобласць з'яўляецца адзіным вытворцам у краіне фарфора-фаянсавага посуду (Добруш), ліставога шкла (Гомель).

Для прыцягнення інвестыцый і стварэння сумесных прадпрыемстваў функцыянуе свабодная эканамічная зона «Гомель-Ратон», рэзідэнты якой

працуюць у многіх гарадах вобласці. Каля 39 % выраблена у рэгіёне прадукцыі ідзе на экспарт.

**Структура і спецыялізацыя сельскай гаспадаркі.** Гомельская вобласць выробляе каля 16 % сельскагаспадарчай прадукцыі краіны. Спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, кормавытворчасці ў спалучэнні са збожжавай гаспадаркай, развітым бульбаводстве і агародніцтве. Вакол Гомеля сфарміравалася зона прыгараднай спецыялізацыі сельскай гаспадаркі.

У структуры пасяўных плошчаў найбольшыя плошчы (56 %) займаюць кармавыя культуры, на другім месцы — збожжавыя (36 %). Па валавых зборах збожжавых вобласць займае апошняе месца ў краіне. У цяперашні час плошчы пасеваў рапсу і гародніны павялічыліся, а бульбы і лёну — паменшыліся. *Падумайце, з чым гэта звязана.* Вытворчасць жывёлагадоўчай прадукцыі ў вобласці таксама невялікая. Па валавой вытворчасці мяса (13 %) і малака (16 %) Гомельская вобласць саступае шматлікім рэгіёнам краіны.

**Геаграфія сферы паслуг.** Удзельная вага галін сферы паслуг у ВРП Гомельскай вобласці — 43,6 %. Па працягласці чыгунак і аўтамабільных дарог, грузаабароце вобласць займае адно з апошніх месцаў у краіне. У грузаабароце значная роля належыць трубаправоднаму транспарту. Колькасць аб'ектаў сацыяльна-культурнай сферы невялікая. Неабходнасць узмацнення медыцынскага кантролю за насельніцтвам, якое пацярпела ад радыеактыўнага забруджвання, прывяла да развіцця аховы здароўя. Традыцыйна развітая сетка аб'ектаў сферы адукацыі: функцыянуе шэсць універсітэтаў, больш за 30 каледжаў і ліцэяў. Гомельская вобласць займае адно з першых месцаў у краіне па колькасці помнікаў (больш за 860), музеяў (26). Турысцкім брэндам вобласці з'яўляецца двухдзённы маршрут «Залатое кальцо Гомельшчыны».

**Буйнейшыя эканамічныя цэнтры вобласці. Гомель** — найбуйнейшы прамысловы і культурны цэнтр вобласці. Ён мае перыферыйнае становішча і размешчаны на ўсходзе вобласці на рацэ Сож. Горад заснаваны ў XII ст., цяпер з'яўляецца другім у краіне па колькасці насельніцтва (535,7 тыс. жыхароў). У горадзе больш за 100 прамысловых прадпрыемстваў, якія спецыялізуюцца на машынабудаванні і металаапрацоўцы, хімічнай прамысловасці. Буйнейшыя прадпрыемствы горада —



Мал. 177. Гомельскі палацава-паркавы комплекс

«Гомсельмаш» і Гомельскі хімічны завод. *Якую прадукцыю яны выпускаюць?* Таксама ў горадзе вырабляюцца шпалеры, мэбля, ліставое шкло, прадукцыя харчовай прамысловасці. Развіта сфера паслуг. Тут працуюць тэатры, музеі, цырк і філармонія. Галоўнай славутасцю горада з'яўляецца Гомельскі палацава-паркавы ансамбль (мал. 177).

Другім па колькасці насельніцтва і прамысловым значэнні горадам у вобласці з'яўляецца **Мазыр** (112 тыс. жыхароў). Горадаўтваральнае прадпрыемства — Мазырскі НПЗ. У горадзе выпрабляецца больш за 80 % харчовай солі. Ацяпляльнае абсталяванне для АПК выпускае прадпрыемства «Мазырсельмаш». Мазыр з'яўляецца адным з буйнейшых рачных партоў краіны. З аб'ектаў сацыякультурнай сферы найбольшае значэнне маюць педагагічны ўніверсітэт, драматычны тэатр.

Адзін з буйнейшых прамысловых цэнтраў вобласці — **Жлобін** (76 тыс. жыхароў). Размяшчаецца ён на поўначы вобласці на рацэ Дняпро. Горадаўтваральным прадпрыемствам з'яўляецца Беларускі металургічны завод. У горадзе таксама выпускаецца прадукцыя харчовай і лёгкай прамысловасці. Сфера паслуг прадстаўлена гандлёвымі аб'ектамі, каледжамі, спартыўнымі збудаваннямі, гісторыка-краязнаўчым музеем, заапаркам.

Буйнымі гарадамі вобласці з'яўляюцца Светлагорск, Рэчыца, Рагачоў, Калінкавічы.

**Знешнеэканамічныя сувязі.** Гомельская вобласць экспартуе нафту, чорныя металы і вырабы з іх, малочную прадукцыю, мінеральныя змешаныя ўгнаенні, машыны і механізмы для ўборкі і абмалоту сельскагаспадарчых культур, звадкаваны газ, пластмасавую тару, паліраванае шкло.

**Абагульнім і запомнім.** Гомельская вобласць самая вялікая па плошчы ў Беларусі. Забяспечана мінеральнымі рэсурсамі. Характарызуецца найбольшай праявай экалагічных праблем. З'яўляецца вядучай у краіне па здабычы нафты і газу, вытворчасці фосфарных угнаенняў, сталі, пракату, збожжаўборачных і кормаўборачных камбайнаў, харчовай солі.

1. Якія карысныя выкапні распрацоўваюцца ў Гомельскай вобласці? 2. Чаму ў вобласці самы нізкі ўзровень сельскагаспадарчага асваення? 3. Назавіце галіны спецыялізацыі вобласці.

4. Якія фактары абумовілі размяшчэнне ў Жлобіне металургічнага завода, а ў Светлагорску — аб'яднання «Хімвалакно» і цэлюлозна-папяровага камбіната? 5. Якія віды прамысловай прадукцыі вырабляюцца толькі ў Гомельскай вобласці, чаму?

***Ад тэорыі да практыкі.*** 1. Прапануйце свае варыянты вырашэння рэгіянальных экалагічных праблем вобласці. 2. Падрыхтуйце паведамленні пра буйныя гарады вобласці.